Камунальныя стасункі

ПУНКТЫ ПЕРАГРЭВУ

Як вярнуць грошы за лішнія градусы ў кватэры

За акном бабіна лета, надвор'е радуе сонейкам і цеплынёй. А вось у многіх кватэрах такой парою асаблівага камфорту не назіраецца, асабліва ў тым жыллі, дзе градус у батарэях цалкам залежыць ад тэмпературы цепланосьбіту і падкруціць-паменшыць спёку ў памяшканні немагчыма. Яно, можа, гарачыня касцей і не ломіць, аднак калі ў вас ледзьве не плюс 30 градусаў на тэрмометры, то колькі ні праветрывай, свежасць у памяшканні хутка знікае і там ізноў горача. Ці можна зрабіць асенні кватэрны градус камфортным, «Звязда» высвятляла ў спецыялістаў.

Адказныя за тэмпературу

Калі ў кватэры больш за суткі цяпло трымаецца на ўзроўні вышэй чым +24 °С, можна смела паведамляць пра гэта ў абслугоўваючую арганізацыю, каб зрабіць пераразлік за лішнія градусы, на якія перагрэлася паветра ў жыллі. Шмат грошай, вядома, не вернеце. Гэта хутчэй маральная кампенсацыя за перагрэў і нясвоечасовае рэагаванне на тэмпературу на вуліцы адказных за гэта службаў.

Калі ў вас зафіксавалі факт перагрэву паветра ў памяшканні, а на наступны дзень праблема не вырашылася і градус цепланосьбіту не адрэгулявалі, можна зноў выклікаць спецыялістаў. І так да той пары, пакуль не будзе вырашана праблема перагрэву, раяць у Мінжылкамгасе.

— Калі складзены прэтэнзійны акт, то пераразлік за перагрэў ці недагрэў памяшкання будзе зроблены за той час, калі тэмпература не адпавядала нормам ад 18 да 24 градусаў, — тлумачыць **Дзмітрый ЧЫКІЗА, начальнік абаненцкага аддзела ЖКГ Заводскага раёна Мінска.** — Аднак пасля спецыялісты абавязкова прыйдуць, каб зафіксаваць, што праблема вырашана, тэмпература стабілізавалася і паслуга пастаўляецца якасная.

Не заўжды, дарэчы, за градус адказваюць камунальнікі. Кантрольна-вымяральнымі прыборамі на цяпло ў дамах цяпер загадваюць падрадныя арганізацыі. У Заводскім раёне сталіцы, напрыклад, гэта прадпрыемства «Домэнергасэрвіс».

Камунальнікі ж могуць толькі зафіксаваць факты перагрэву і накіраваць звесткі на рэагаванне.

— Мы бачым, што нехта перагараецца, толькі тады, калі людзі звоняць у службу «115» і скардзяцца на перагрэў, — сведчыць **Лілія ЕРМАЛАЕВА, дырэктар ЖЭУ № 4 Заводскага раёна Мінска.** — Мы спускаемся ў цеплавузел у падвале і бачым, што там сапраўды ёсць завышэнне тэмпературы цепланосьбіту. Пасля падымаемся ў кватэру і замяраем тэмпературу паветра, пасля чаго адсылаем звесткі ў абслугоўваючую фірму. Нашым спецыялістам забаронена карэкціраваць работу прыбораў.

Кантрольная гадзіна — шэсць раніцы

Ёсць у жыллёвай гаспадарцы спецыяльны абаненцкі аддзел, абсталяваны сістэмай дыстанцыйнага здымання паказчыкаў, да якой падключаны ўсе групавыя прыборы ўліку і сістэмы рэгулявання. У гэтай сістэме бачна ўсё цепласпажыванне ў дамах.

— Штодня інжынер Домэнергасэрвісу аналізуе архівы параметраў па стане на шэсць раніцы і дае заданне наладчыкам ліквідаваць пэўную праблему, — кажа Дзмітрый Чыкіза. — Напрыклад, дзесьці няспраўны клапан, дзесьці трэба замяніць датчык вонкавага паветра і г. д. У іх ёсць рэзервовы фонд, каб аператыўна вырашаць такія пытанні.

У пачатку ацяпляльнага сезона ЖЭС запускае сістэму ацяплення, а Домэнергасэрвіс пасля наладжвае яе і пераводзіць у аўтаматычны рэжым, у якім яна сама павінна функцыянаваць аўтаномна і падстройвацца пад надвор'е без удзелу людзей.

Чаму, нягледзячы на градусы, бачныя ў рэжыме рэальнага часу, многія кватэры працягваюць перагравацца, адказаць адназначна цяжка. Рэдка, але здараецца, што сістэма выходзіць са строю, і тады трэба пераводзіць ацяпленне ў ручны рэжым, каб падтрымліваць параметры ў пэўным стане адпаведна градусу за акном.

— Магчыма, праблема ў тым, што ў нейкім пэўным выпадку зламалася абсталяванне — напрыклад, выйшла са строю помпа або рэгулюючы клапан не адгукаецца на сігнал у шафе кіравання, — разважае начальнік абаненцкага аддзела. — Акрамя таго, ніхто не адмяняў і чалавечы фактар ва ўзаемасувязі эксплуатуючых службаў і Домэнергасэрвісу. Той жа ЖЭС можа, атрымаўшы прэтэнзію на перагрэў, перавесці сістэму на работу ў ручным рэжыме і так вырашыць праблему. Аднак калі сістэма ўжо працуе на мінімальных настройках, а ў кватэры ўсё роўна горача, то тут ужо зрабіць штосьці немагчыма, калі на батарэі няма рэгулятара цяпла, пакуль за акном не пахаладае.

Інфармацыя пра недагрэў ці перагрэў у кватэры з абаненцкага аддзела накіроўваецца ў разлікова-даведачны цэнтр, дзе і робяць пераразлік за лішнія або недагрэтыя градусы ў жыллі.

Ірына СІДАРОК.

КІРМАШ НА ПАКРОВЫ

У Магілёве такім чынам адзначылі прыгожае восеньскае свята

Магчыма, таму гэты кірмаш быў па-сапраўднаму цёплы, шчыры і святочны — з песнямі, танцамі, гульнямі, смачнымі шашлыкамі і майстар-класамі. Прыгажуні ў народных строях дэманстравалі сцэнкі з вясковага жыцця, жартавалі, уцягвалі народ у свае гульні. І ўсё гэта на фоне бойкага гандлю садавіной-гароднінай на любы густ, а таксама рыбай і мясам. Напрыклад, кілаграм бульбы можна было купіць за 48 капеек, морквы — за 45, капусты (самая пара квасіць) — за 46, а за кіло квашанай прасілі амаль 2 рублі. Цыбуля каштавала ад 63 капеек за кіло, памідоры па 2 рублі з паловай, журавіны — 4 рублі 45 капеек. Мяса таксама прапаноўвалі на любы густ — акрамя традыцыйнай курацыны, свініны і ялавічыны, можна было набыць, напрыклад, мяса труса або бараніну. І які гандаль без рыбы, цяпер якраз сезон продажу гэтага смачнага прадукту. Карпа і амура аддавалі па 5 рублёў за кіло, таўсталобіка за 4, карася за 3 рублі. Попыт быў на ўсё.

— Восенню кірмашамі нікога асабліва не здзівіш, але гэты хацелася зрабіць у стылі даўніх традыцый, калі людзі збіраліся не толькі нешта купіць, але і адпачыць, — адзначыў **начальнік упраўлення гандлю і паслуг Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір КАЗУСЕЎ.** — У ім прыняло ўдзел больш за 40 суб'ектаў гаспадарання, індывідуальных прадпрымальнікаў і фізічных асоб. Улічваючы тое, што народ сюды прыйшоў хутчэй адпачыць, чым закупіць на зіму бульбу і тую ж капусту з буракамі і морквай, тавараабарот атрымаўся неблагі — больш за 24 тысячы рублёў. Але гараджанам усё ж такі цікавей купляць садавіну-гародніну бліжэй да сваіх дамоў. У Магілёве існуе графік правядзення кірмашоў ажно да 17 лістапада. Прычым працуюць гэтыя пункты пастаянна, не толькі ў выхадныя дні. У сярэднім суб'екты нагандлёўваюць па 30 тысяч рублёў у дзень.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Улада ў Польшчы засталася за правымі кансерватарамі

На выбарах у парламент краіны перамагла кіруючая партыя. Выйгрыш «Права і справядлівасці» быў упэўнены, са значным адрывам ад сапернікаў. Акрамя таго, правым кансерватарам удалося палепшыць свой ранейшы вынік. Экзітполы паказалі, што за праграму «Права і справядлівасці» прагаласавалі 43,6 працэнта выбаршчыкаў.

Партыя Яраслава Качыньскага атрымлівае ў Сейме мінімум 239 мандатаў з 460. Такім чынам, у «Права і справядлівасці» маецца магчымасць фарміраваць кабінет міністраў і працягваць рэалізацыю палітычнай і эканамічнай праграм, прымаючы законы без уступлення ў кааліцыі.

Японія аднаўляецца пасля тайфуну «Хагібіс»

Як мінімум 37 чалавек загінулі і 13 зніклі без вестак у выніку наймацнейшага за 60 гадоў тайфуну ў Японіі. Пра гэта паведаміў тэлеканал TBS. Мясцовыя экстранныя службы папярэджваюць, што гэтыя лічбы з высокай доляй верагоднасці могуць павялічвацца па ходзе правядзення пошукава-выратавальных аперацый у розных рэгіёнах краіны. Увечары ў суботу тайфун «Хагібіс», што азначае «хуткасць» у перакладзе з тагальскай, абрынуўся на асноўны японскі востраў Хансю ў раёне паўвострава Ідзу. Хуткасць ветру ў цэнтры даходзіла да 45 метраў у секунду, пры парывах — да 65. Больш за сем мільёнаў чалавек былі вымушаныя пакінуць свае дамы ва ўмовах моцнай паводкі і апоўзневых папярэджанняў. У Токіа і суседніх прэфектурах каля 53 тысяч дамоў засталіся без святла. Больш чым у 130 тысяч кватэр і дамоў па ўсёй краіне адсутнічае водазабеспячэнне.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні прэм'ер-міністру Японіі Сіндза Абэ ў сувязі з гібеллю людзей і шматлікімі разбурэннямі ў выніку тайфуну.

У Ватыкане кананізавалі пяць новых святых

Рымска-каталіцкая царква кананізавала англійскага прапаведніка Джона Г. Ньютана і чатырох жанчын-благаслаўлёных. Урачыстая імша з абрадам прылічэння да ліку святых прайшла на плошчы Святога Пятра ў прысутнасці тысяч вернікаў. Папа Рымскі Францыск падкрэсліў, што кананізаваныя праяўлялі асаблівую святасць у паўсядзённым жыцці. Пантыфік спаслаўся на словы Джона Г. Ньютана аб глыбіні ўнутранага свету католікаў. На цырымонію прыехаў прынц Уэльскі Чарльз. У артыкуле для афіцыйнай газеты Ватыкана «Рымскі аглядальнік» ён напісаў, што Ньюман пакінуў шматвяковую спадчыну перш за ўсё як асветнік, які шакіраваў віктарыянскае грамадства барацьбой за свае перакананні і настойлівасцю пры пераходзе ў каталіцтва.

Надвор'е

Бабіна лета, і без варыянтаў

Тэмпература паветра будзе падымацца ўначы да плюс 12 градусаў, а ўдзень наогул — да 21—23 цяпла

Вось у сярэдзіне кастрычніка да нас і прыйшлі цёплыя і сухія дзянькі. На гэтым тыдні будзе пераважаць антыцыкланальны характар надвор'я, пераважна без ападкаў. Толькі ў сярэдзіне тыдня малаактыўныя атмасферныя франты, якія будуць перамяшчацца праз тэрыторыю краіны, выклічуць месцамі кароткачасовыя дажджы. Тэмпературны фон на гэтым тыдні будзе ўтрымлівацца на 4—7 градусаў вышэй за кліматычную норму, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Ужо заўтра, 16 кастрычніка, будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўночным захадзе краіны малаактыўны атмасферны фронт абумовіць у асобных раёнах невялікія кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 5 па паўночным усходзе да плюс 12 градусаў па захадзе краіны. Удзень будзе 14—21 цяпла, па поўдні краіны паветра прагрэецца да 23 градусаў. У чацвер бабіна лета злёгку сапсуецца. А ўсё таму, што сонечнае надвор'е паціху адступіць: пад уплывам малаактыўнага атмасфернага фронту месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—12 градусаў вышэй за нуль, удзень будзе ў асноўным ад плюс 12 да плюс 18 градусаў, па поўдні — 19—21 цяпла. У пятніцу месцамі па паўночнай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, але яны будуць зусім невялікія і толькі ў некаторых месцах. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца туман. Тэмпература паветра ноччу складзе 6—12 цяпла, а ўдзень будзе ад плюс 11 да плюс 17 градусаў, па поўдні краіны — да 18—20 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя дні чакаецца цёплае, пераважна без ападкаў, надвор'е. У суботу і нядзелю будзе ў асноўным суха і сонечна. Уначы і раніцай месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 цяпла, а ўдзень — ад плюс 12 да плюс 18 градусаў, па поўдні краіны — да 19—21 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Трагедыя

Ліхач загінуў не адзін

Позна вечарам 12 кастрычніка ў цэнтры Гомеля адбылася аўтааварыя, якую і цяпер абмяркоўваюць жыхары абласнога цэнтра.

21-гадовы кіроўца BMW 740 на велізарнай хуткасці выехаў на правы па ходзе руху тратуар — імчаўся ў бок плошчы Леніна. Пасля гэтага хлопец урэзаўся ў слуп і здзейсніў наезд на трох жанчын-пешаходаў. У выніку аварыі загінулі кіроўца іншамаркі і 42-гадовая жанчына, завуч гомельскай школы Ала К. Дзве яе калегі Вольга П. і Таццяна Б. трапілі ў медыцынскую ўстанову. Таццяна знаходзіцца ў абласной клінічнай бальніцы са складанымі траўмамі, а Вольгу ўрачы адпусцілі дадому ў той жа вечар.

Стала вядома, што жанчыны напярэдадні ўтрох гулялі па цэнтры горада. У момант здарэння яны ішлі каля летняй тэрасы рэстарана «Бацькі». За некалькі хвілін да трагедыі было зроблена агульнае сэлфі на памяць пра прыемную сустрэчу. Цяпер гэты шчаслівы здымак нагадвае пра непапраўнае...

Сумкі, тэлефоны і асабістыя рэчы жанчын разляцеліся па вуліцы Савецкай на некалькі дзясяткаў метраў. Ала К. загінула адразу, а Таццяну Б. забрала машына хуткай дапамогі, якая праязджала побач. Медыкі ехалі на іншы выклік, але ўмомант адрэагавалі на транспартнае здарэнне. Тут жа прыехалі ўсе выратавальныя службы.

Пра кіроўцу BMW вядома, што ён вучыўся ў Гомелі ў Міжнародным універсітэце «МІПСА». **Афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці Марыя КРЫВАНОГАВА** паведаміла, што ён быў сярод многіх студэнтаў юрыдычных факультэтаў розных ВНУ, якія штогод праходзяць практыку ў следчых падраздзяленнях УСК па Гомельскай вобласці.

— Толькі летась ва ўпраўленні СК па Гомельскай вобласці прайшоў практыку 191 чалавек. Сапраўды, 21-гадовы кіроўца, які загінуў 12 кастрычніка ў ДТЗ на вуліцы Савецкай горада Гомеля, у пачатку года праходзіў перадыпломную практыку ва ўпраўленні СК.

У сацыяльных сетках ёсць відэа, якое дэманстраваў сам хлопец. На ім аўтар на вялізнай хуткасці едзе па прамой і самай доўгай вуліцы горада — пры гэтым неаднаразова ігнаруе чырвонае святло.

Па факце смяротнай аварыі ўзбуджана крымінальная справа. Следчыя ўстанаўліваюць прычыны трагедыі. Акалічнасці здарэння высвятляюцца, прызначана правядзенне судова-медыцынскіх і аўтатэхнічных экспертыз. Праваахоўнікі просяць грамадзян, якія бачылі ДТЗ ці маюць запісы відэарэгістратара пра яго, патэлефанаваць па нумары 8 044-763-64-12.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.